# Урок 103



- Капуста цяжэйшая за кабачок. Маса капусты большая за масу кабачка.
- Кабачок лягчэйшы за капусту.
  Маса кабачка меншая за масу капусты.
- Маса памідора і маса агурка аднолькавыя.

**1.** Параўнай цацкі па масе.



**2.** Што цяжэйшае? Што лягчэйшае?








**3.** Вылічы.

| | | |
|---|---|---|
| 17 – 4 | 16 + 4 – 7 | 15 + 5 + 0 |
| 12 + 5 | 15 – 10 – 3 | 14 + 6 – 0 |
| 20 – 9 | 18 – 5 + 7 | 16 – 16 + 13 |

**4.** У шкатулцы было 2 дзясяткі . Узялі 7 . Колькі  засталося?

**5.** Разгледзьце табліцу. Колькі грошай у кожнага дзіцяці? Хто з іх зможа купіць альбом за 10 рублёў?

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Даша |  |  |  |  |  | | |
| Ваня |  |  |  |  |  |  |  |
| Іра |  |  |  |  |  | | |

Параўнай прадметы па масе. Што цяжэйшае? Што лягчэйшае?






16 – 3 ? 12

17 ? 11 + 8



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

Каб вымяра́ць масы прадметаў, выкарыстоўваюць мерку — **кілаграм**.




Кілаграм — адзінка масы.







- Маса капусты — 2 кілаграмы.
  Маса гарбуза — 3 кілаграмы.
- Гарбуз цяжэйшы за капусту.
  Капуста лягчэйшая за гарбуз.

**1.** Якая маса дыні? Кавуна? Што цяжэйшае? Што лягчэйшае?







**2.** Віця сабраў 2 кг макулатуры, а Андрэй — 10 кг. Колькі кілаграмаў макулатуры сабралі хлопчыкі разам?

**3.** Якія знакі дзеянняў схаваны за ?

15  2  3 = 14 10  7  3 = 6

**4.** 7 кг – 5 кг + 10 кг ? 7 кг – 4 кг + 10 кг

12 кг + 6 кг – 3 кг ? 12 кг + 6 кг – 4 кг

Ці можна выканаць параўнанне без вылічэнняў?

**5.** Выберы схему. Рашы задачу.

Пяцёра дзяцей узялі ў бібліятэцы 4 кнігі, а часопісаў — на 2 больш. Колькі часопісаў узялі дзеці?




**6.** Вымерай даўжыні адрэзкаў.
Знайдзі суму даўжынь гэтых адрэзкаў.



**7.** Што Міца намаляваў спачатку?
Што — потым?



Што лягчэйшае — 2 кг цыбулі або 5 кг бульбы?
Што цяжэйшае — 3 кг пуху або 3 кг металу?

Вылічы.

20 кг – 10 кг

15 кг + 5 кг – 7 кг



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі